Аддзел па адукацыі Міёрскага раённага выканаўчага камітэта
Дзяржаўная ўстанова адукацыі “Чапукоўская сярэдняя школа”

Матэрыял (план-канспект урока)
для ўдзелу ў раённай дыстанцыйнай выставе-конкурсе
“Магу навучыць…”

Падрыхтавала Пяткевіч Н.А.,
настаўнік пачатковых класаў I кваліфікацыйнай катэгорыі

аг.Чапукі, 2024

1 клас Навучанне грамаце (паслябукварны перыяд)

Тэма: Чытаем пра Беларусь і беларусаў. *Пазакласнае чытанне на тэму “Назвы родныя здавён”*

Мэта: фарміраваць навык свядомага чытання тэкстаў, уменне працаваць з тэкстам выбарачна, паглыбіць веды дзяцей аб роднай краіне, пашырыць слоўнікавы запас вучняў па тэме, развіваць вуснае маўленне. Садзейнічаць выхаванню пачуцця любові да сваёй малой радзімы і да роднага краю.

Планіруемыя вынікі:

Пазнаваўчыя:

- ✔ уменне ставіць мэту да ўрока;
- ✔ усвядоміць значэнне слоў “Айчына”, “Бацькаўшчына”;
- ✔ даведацца новыя назвы беларускіх гарадоў;
- ✔ будаваць правільныя моўныя выказванні і асэнсавана чытаць сказы, тэксты.

Камунікатыўныя:

- ✔ працаваць у пары і ў групе;
- ✔ дамаўляцца ў сумеснай дзейнасці;
- ✔ праяўляць актыўнасць для рашэння пазнаваўчых задач.

Рэгулятыўныя:

- ✔ выбіраць дзеянні ў адпаведнасці з пастаўленай задачай;
- ✔ ацэньваць сябе, межы свайго ведання і неведання;
- ✔ выпрацоўваць самастойнасць;
- ✔ адэкватна ўспрымаць заўвагі і прапановы настаўніка.

Асобасныя:

- ✔ праяўляць цікавасць да вывучэння тэмы, усведамленне свайго поспеху на ўроку;
- ✔ развіццё добразычлівасці, увагі да аднакласнікаў.

Абсталяванне: малюнак бусла, фота краявідаў роднай прыроды, відэаролік “Мая Беларусь” (https://youtu.be/KHtzbHUUIKI), нагляднасць для рэфлексіі і фізпаўзы, каляровыя алоўкі, раздатачны матэрыял з прыказкамі, смайлікі са шнурочкамі для работы ў пары, пазл “Збяры Беларусь у сваім сэрцы”, маска бусліка, выстава кніг па тэме.

Ход урок

І.Арганізацыйны момант.

Настаўнік:

Добрае ранне сонцу і птушкам,

Добрае ранне сынкам і дачушкам!

Добрае ранне ўсім добрым людзям.

Шчыра вітацца мы ўсе не забудзем!

(Вучні вітаюць адзін аднаго, дакранаючыся далонямі, кіўком галавы вітаюць гасцей)

Званочкам звонкім урок павітаўся.

Сядзем за парты. Занятак пачаўся!

ІІ.Актуалізацыя ведаў

- Дзеці, а вы любіце гуляць у хованкі? Вось і словы вырашылі з намі пагуляць у хованкі. Пашукайце іх пад сваімі стульчыкамі. Хто знайшоў, прачытайце іх па чарзе.

“Стыкер пад стул” (на стыкерах запісаны словы: Мінск, бусел, край, зубр, герб, Баць-каў-шчы-на, родная зямля, Айчына) *Вучні, якія знайшлі лісток, чытаюць словы ўголас са стыкера, а затым з картак, што ЗА ДОШКАЙ)*

- Як вы мяркуеце, якой адной тэмай аб’яднаны гэтыя словы?
  (слова БЕЛАРУСЬ – дабавіць!)
- Ці ўсе значэнні слоў вам вядомыя? Выкажыце сваё меркаванне.

- ***Што такое Бацькаўшчына***, ***Айчына*****?**

Знаеш? Гэта рэчка, сцежачка лясная,

Гэта ў лузе залатая пчолка,

А ў вачах тваіх — вясёлка.

Бацькаўшчына — гэта дом твой, Школа;

Гэта песні, што звіняць наўкола,

Гэта сам ты, Гэта тата твой і мама.

І сябры твае таксама.

ІІІ. Паведамленне тэмы ўрока і задач.

- Сення **тэма нашага ўрока** “Чытаем пра Беларусь і беларусаў”.
- А калі мы з вамі на ўроку чытання, то якую МЭТУ ставім? Да чаго будзем імкнуцца? (Палепшыць сваё чытанне, даведацца новае пра нашу Радзіму, мы паназіраем за прыгажосцю роднага краю, пазнаем нязведанае).
- І, канешне, будзем працаваць дружна, дапамагаць адзін адному.

1.Моўная размінка. (запіс на дошцы)

На бярозе белы бусел,

Пад бярозаю – ручай.

А завецца Беларуссю

Непаўторны родны край! *А.Вольскі*

- Я прачытаю, а вы сачыце за мной толькі вочкамі;
- Прачытаем шэптам;
- Прачытаем суседу выразна.
- Скажыце, з кім было добра працаваць?
- Чаму паэт называе наш край **непаўторным**? Чым славіцца наша краіна?
- Скажыце, хто з’яўляецца кіраўніком нашай краіны? Якім словам яшчэ можна назваць яго? Расшыфруйце.

п	р	з	д	н	т

- Расшыфруйце словы, што на картках: (на наборным палатне)

с	ц	г

г	р	б

г	м	н

- Якім адным словам назавём гэтыя паняцці? (Сімвалы)

3. Кагнетыўная зарадка “Вуха-нос” на ўважлівасць!

1,2,3! На мяне глядзі!

- **Настаўнік:**
- Зараз прапаную вам палюбавацца непаўторнымі краявідамі нашай роднай зямлі.

4. Прагляд відэароліка “Гэта Беларусь мая” (QR-код – спасылка на відэа)

- **Уступнае слова пра Беларусь**

Вялікая Радзіма складаецца з мноства маленькіх куткоў і куточкаў, якія з’яўляюцца самымі лепшымі ў свеце, самымі дарагімі.

- Як можна назваць месца, дзе нарадзіўся, дзе жывеш? (Радзімай, родны куточак, край)

Вучаніца:

Калі хто мяне пытае:

- Ты адкуль? З якога краю?

Я адказваю заўсёды:

- З Беларусі мілай, роднай.

Там зялёныя бярозы.

Там на клёнах ззяюць росы.

Я душой усёй люблю

Сваю родную зямлю. (Ацэнка чытання на памяць)

Настаўнік:

-Наша сяброўка (як яе завуць?) Кірыліца завітала зноў да нас на ўрок і просіць нас даведацца, як па-іншаму называюць нашу краіну.

5. Работа па Буквару, с.156. тэкст “Айчына”

1,2,3! На мяне глядзі!

а) Слыхавое ўспрыманне тэксту.

б) Чытанне “**гудучае”** ў паўголаса сам сабе, затым “ланцужком”.

- Як названа наша Радзіма?

- З якім пачуццём расказвае аўтар пра нашу Радзіму?

(у кожнага на стале карткі-падказкі: **пачуццё любові, гонару**)

- Зачытаць сказ, у якім даецца поўная назва нашай краіны.

6. Работа ў групах. “Збяры Беларусь у сваім сэрцы” **З пазлаў** сабраць нашу краіну.

- Якая птушка з’яўляецца сімвалам нашай Беларусі? (**Бусел)**

Таму нашу краіну называюць “краінай пад белымі крыламі” .

- А буслы ўжо прыляцелі?

7. Інсцэніроўка верша “Хлопчык і бусел”

Вучаніца: -Бусел-бусел, клёка-клёка,
Дзе ты жыў?

Бусел (вучань): -Я жыў далёка: за гарамі, за лясамі,
Там, дзе Ніл, на поўдні самым.

Вучань: - Што за Ніл?

Бусел: -Рака такая,
Нібы мора, гаманкая,

Вучань: -Як жа ты там,

бусел, жыў?

Бусел: -Я не жыў, - усё тужыў,

Дзе б ні быў, дзе б ні лятаў,

Родны край успамінаў.

ФІЗПАЎЗА **“Беларускі край” малюнкі на дошцы:**

Над зямлёй крыляе бусел (**махаць рукамі)**

Скачуць конікі ў траве (**на дзвюх нагах)**

Дзед жыве ў Беларусі (**маршыруюць**)

І бабуля тут жыве.

Тут жывуць і мама з татам (**улева, управа паварот)**

Брацік мой, мая сястра **(нахілы)**

Тут жыву і я таксама (**маршыруюць)**

Беларусь – мой родны край! (**пляскаць у далоні)**

8. Рубрыка “Гэта цікава!” (пра бусла)

Гэта птушка карыстаецца асаблівай павагай беларусаў.

Буслоў лічаць узорам сямейнага жыцця.

Народная традыцыя забараняла крыўдзіць буслоў, разбураць іх гнёзды. Буслы маглі крыўдзіцелю і адпомсціць – “занячысціць” калодзеж, кінуўшы ў яго гадзюку, ці наносіць вужоў у хлеў.

З ім звязана шмат народных прыкмет і павер’яў. Лічылася, калі пры першай сустрэчы з буслом будзеш мець грошы ў кішэні – да багацця. У нашай Віцебскай вобласці быў такі рытуал. Каб не балелі ногі, беглі ўслед за буслом, пабачыўшы яго вясной.

-Чым багатая наша Беларусь? Раскажыце.

9. Работа ў парах

Гульня “Парадуй Смайліка” (са шнурочкамі):

-Назваць па чарзе буйныя гарады Беларусі .

-З кім вам было камфортна працаваць? Чаму?

Работа з прыказкамі.

Выбіраем па адной на парту. Прачытаем. Растлумачым сэнс яе.

10.Знаёмства з выставай кніг па тэме.

У гэтых кнігах вы зможыце прачытаць пра веліч нашай краіны, яе дасягненні, пра таленавітых умельцаў – нашых землякоў. Чытайце і вы даведаецеся шмат чаго новага.

III. Замацаванне. Тэсціраванне “Крыжыкі - нолікі”

1. Наша краіна – РБ ? +
2. Нашага прэзідэнта завуць У.У.Пуцін? 0
3. У Беларусі 6 абласцей? +
4. Полацк – сталіца Беларусі? 0
5. Нашы суседзі – амерыканцы? 0
6. Нашы суседзі – расіяне? +
7. Сваю Радзіму называем Айчына? +
8. Мы жывем у Віцебскай вобласці? +
9. Сож – гэта горад? 0

Ключ на дошцы:

1. х	**2**. 0	**3**. х
4. 0	**5.** 0	**6**. х
7. х	**8**. х	**9**. 0

IV. Абагульненне:

- Як вы лічыце, ці дасягнулі мы сення сваёй мэты?

Вы сёння працавалі старанна. Мне было прыемна чуць вашы адказы. Мяне сёння асабліва парадавалі… Вы – МАЛАЙЦЫ!

Ацэнка работы вучняў на ўроку (НАКЛЕЙКІ)

V. Рэфлексія.

1.Узаемаацэнка работы таварыша.

Выберыце аднага таварыша, каму хочаце сказаць “дзякуй” за сумесную работу на ўроку.

2. Самаацэнка сваёй работы.

Дзякую ўсім за работу!

ДАДАТАК




На бярозе белы бусел,
Пад бярозаю – ручай.
А завецца Беларусь
Непаўторны родны край!
Пры 5
ім


Тэма ўрока:
Чытаем пра Беларусь


"Збяры" Беларусь
у сваім сэрцы.
Гродна
Мінск
Брэст



